# Мы любім вашых герояў...

Яшчэ задоўга да пачатку вечара ў вестыбюлі інтэрната рабочых будаўнічага трэста № 4 горада Мінска з'явіўся маляўнічы плакат. У ім паведамлялася, што ў клубе інтэрната адбудзецца сустрэча з вядомым беларускім пісьменнікам Міхасём Лыньковым, прысвечаная 60-годдзю з дня яго нараджэння.

...Адзін за адным на трыбуну падымаюцца маладыя будаўнікі. Яны гавораць аб творах Міхася Лынькова, дзеляцца сваімі думкамі, пачуццямі.

— Дарагі Міхась Ціханавіч, мы любім вашых герояў, яны блізкія і дарагія нам,—усхвалявана гаворыць тынкоўшчыца Тацяна Еўчанка, член брыгады, якая змагаецца за права называцца калектывам камуністычнай працы.

— Мой бацька ў час Вялікай Айчыннай вайны змагаўся ў партызанскім атрадзе, — расказвае цясляр Васіль Шыманскі.—У адным з баёў ён загінуў. Вось чаму кніга «Векапомныя дні», якая вучыць горача любіць сваю Радзіму, для мяне асабліва блізкая і дарагая.

Аб вялікім выхаваўчым значэнні кніг М. Лынькова гаварылі сакратар камсамольскай арганізацыі трэста Эдуард Карніловіч, рабочая УНР-11 Зінаіда Алексютовіч. Незабыўнае ўражанне засталося ў работніцы УНР-12 Фаіны Місюнь ад жаночых вобразаў твораў пісьменніка.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі будаўнікі выступленне М. Лынькова. Ён горача падзякаваў рабочым за цёплыя словы ў яго адрас, гаварыў аб непарыўнай сувязі літаратуры з жыццём народа, аб вялікай адказнасці пісьменнікаў за камуністычнае выхаванне савецкіх людзей.

**У. МАЛІБОШКА,**
**супрацоўнік Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна.**